*Расціслаў Бузук*

# Абнаўленне патрабуе творчасці

Сёлетняя, 71-я гадавіна Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі адзначана ўмацаваннем курсу партыі і народа на перабудову. З найбольшай пераканальнасцю гэта выявілася ў рабоце XIX Усесаюзнай канферэнцыі КПСС і ў прынятых ёю рэзалюцыях.

Актывізаваліся ўсе сферы культурнага жыцця. Кожны дзень прыносіць новыя і новыя сведчанні таго, што праблемы літаратуры і мастацтва, культуры ў цэлым далёка выходзяць за межы ўласна эстэтычнай праблематыкі ў традыцыйным яе разуменні, усё больш становяцца як бы індыкатарам, а то і мадэллю агромністых духоўных працэсаў, што адбываюцца ў грамадстве, у грамадскай свядомасці ў прыватнасці.

І гэта не дзіўна. Свет культуры — адзін з самых чуйных і эмацыянальных у грамадскім жыцці. Тут павышаная ўражлівасць і спагадлівасць, абвостранае маральнае пачуццё «спрацоўваюць» тым хутчэй і мацней, чым больш доўгачаканыя і надзённыя перамены ў грамадстве, чым больш энергічна і рашуча выяўляюць яны наспелыя агульнанародныя інтарэсы.

Культурная палітыка XXVII з'езда КПСС узнаўляе і паслядоўна на ўсіх напрамках прадаўжае ленінскі падыход да культуры як спецыфічнай формы духоўнай вытворчасці і разам з тым як састаўной часткі агульнапартыйнай, агульнанароднай справы сацыялістычнага пераўтварэння грамадства і чалавека.

Новыя ідэі партыі адухаўляюць жыццё грамадства, ясней вызначаюць шлях і мэту руху, вяртаюць жывы сэнс ленінскай тэарэтычнай спадчыны і практычнага вопыту краіны пры У. І. Леніне, маральных асноў сацыялізму, яго зыходных дэмакратычных прынцыпаў.

Пасля красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС усё часцей і часцей ставіцца пытанне пра неабходнасць вяртання да ленінскага разумення характару заканамернасцей развіцця ўсіх сфер сацыялістычнай сістэмы. У. І. Ленін, які не цярпеў у рабоце схаластыкі, абстрактнасці, акадэмічнай сухасці, папярэджваў камуністаў наконт суб'ектывізму, валюнтарызму, наіўнай веры ў тое, што ўсе праблемы сацыялістычнага будаўніцтва могуць быць вырашаны «камуністычным дэкрэтаваннем». Гэта, вядома, у значнай меры адносіцца і да дзеяння аб'ектыўных законаў развіцця духоўнай сферы, творчасці, дзе, як падкрэсліваў У. І. Ленін, ні ў якім разе недапушчальна «са сваіх эстэтычных сімпатый і антыпатый» рабіць «кіроўныя ідэі».

Ужо ў рабоце У. І. Леніна «Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура» (1905 г.) упершыню ў гісторыі сусветнай эстэтычнай думкі сфармулявана і ўсебакова абгрунтавана палажэнне пра партыйнасць мастацкай творчасці. У гэтай і іншых ленінскіх работах раскрыты творчыя прынцыпы пралетарскага, сацыялістычнага мастацтва, а таксама — аб'ектыўныя заканамернасці функцыянавання мастацкай сістэмы сацыялізму. Вось некаторыя з іх:

«літаратурная справа», мастацтва павінны стаць састаўной часткай арганізаванай, планамернай, аб'яднанай партыйнай работы;

«літаратурная справа», мастацтва не могуць быць сродкамі нажывы асоб або нейкай групы і ўвогуле індывідуальным клопатам, незалежным ад агульнай пралетарскай справы;

«літаратурная справа», мастацтва павінны быць вызваленымі ад анархічнага індывідуалізму;

«літаратурная справа», мастацтва менш за ўсё падлягаюцца механічнаму раўнаванню, нівеліраванню, дыктату большасці над меншасцю;

у літаратуры, мастацтве безумоўна неабходна забеспячэнне большай прасторы асабістай ініцыятыве, індывідуальным схільнасцям, прасторы думкі і фантазіі, форме і зместу;

у «літаратурнай справе», мастацтве нельга прапаведваць якую-небудзь аднолькавую схему або вырашэнне задач некалькімі пастановамі; «аб схематызме ў гэтай галіне менш за ўсё можа ісці гаворка»;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пралетарскае, сацыялістычнае мастацтва ствараецца на аснове развіцця лепшых узораў, традыцый, вынікаў існай культуры, перапрацоўкі ўсяго, што было каштоўнага ў больш чым двухтысячагадовым развіцці чалавечай думкі і культуры.

Аднак трэба прызнаць, што на працягу дзесяцігоддзяў многія з гэтых прынцыпаў, заканамернасцей парушаліся адмініструваннем, некампетэнтным умяшаннем, нівеліроўкай, навязваннем уласных эстэтычных густаў, менавіта сімпатый і антыпатый, з якіх рабіліся «кіроўныя ўказанні». Гаворыцца пра дзеянні заўзятых адміністратараў, чыноўнікаў ад культуры і, не менш, пра негатыўныя тэндэнцыі, што бывалі ў канцы 70-ых — пачатку 80-ых гадоў у самім творчым асяроддзі. Невыпадкова на XXVII з'ездзе КПСС дзеячам культуры і мастацтва адрасавалася крытыка з прычыны кан'юнктуршчыны і дзялянцтва, адміністравання, чынашанавання і абслугоўвання аўтарскіх самалюбстваў і амбіцый.

На лютаўскім (1988 г.) Пленуме ЦК КПСС М. С. Гарбачоў падкрэсліваў, што «адзін з галоўных урокаў, якія мы павінны атрымаць з мінулага, крыецца ў наступным: калі ўжо мы рашуча адмаўляемся ад каманднa-адміністрацыйных метадаў у эканоміцы, то падобныя метады ў духоўным прагрэсе грамадства тым больш непрымальныя. Дэмакратызм, давер да людзей, цярпімасць да нязвыклага, да пошукаў, кампетэнтнасць, добразычлівасць заахвочванне ініцыятывы і наватарства, падтрымка талентаў — вось ключавыя прынцыпы партыйнай работы ў пытаннях культуры, у духоўнай сферы перабудовы».

Партыя цвёрда ўзяла курс на клапатлівае, кампетэнтнае і дальнабачнае стаўленне да працэсаў у духоўнай сферы нашага грамадства, якія садзейнічаюць яе ачышчэнню і ўзбагачэнню, узвышэнню маралі і росту стваральнага патэнцыялу. У ходзе перабудовы складаюцца ўсё больш спрыяльныя ўмовы для культуры, інтэлектуальнага і маральнага ўдасканалення людзей, выяўлення талентаў, выхавання грамадзянскіх якасцей асобы.

Аднак было б няправільна меркаваць, што вірус застою, грамадзянскай пасіўнасці, этычнай неперабарлівасці, заспакоенасці, а таксама бюракратычныя навыкі, амбіцыі самі па сабе адыдуць ў нябыт і адыдуць нехваравіта, без намаганняў, без барацьбы. Сёння створаны рэальныя перадумовы для таго, каб выкараніць гэтыя недахопы з нашай практыкі. Але дзеля сапраўднай перамогі належыць яшчэ шмат што перайначыць. І асабліва ў свядомасці, псіхалогіі людзей. Адзін толькі характэрны прыклад.

Як вядома, XXVII з'езд КПСС асудзіў «рэшткавы прынцып» у падыходзе да культуры. На практыцы ж, ды і ў мысленні некаторых работнікаў ён нярэдка яшчэ заяўляе пра сябе. Да сённяшняга многія таварышы, у тым ліку партыйныя работнікі, пад крытыкай рэшткавага падыходу разумеюць у лепшым выпадку пераадоленне няўвагі да матэрыяльна-тэхнічнай базы, кадраў культуры, клопату пра іх сацыяльныя і бытавыя патрэбы. Часткова гэта правільна. Але тым, што пабудуем клубы, павысім зарплату, дадзім жыллё культасветработнікам, праблема не вычэрпваецца.

Рэшткавы прынцып небяспечны не толькі абыякавасцю да матэрыяльнай базы культуры. Яшчэ больш ён небяспечны ўпэўненасцю, перакананнем, што культура, мастацтва — гэта так званае «культурнае абслугоўванне», тое, што заклікана зрабіць нас больш высакароднымі, прынесці задавальненне, адцягнуць ад жыццёвых праблем, як лёгкі канцэрт, пацяшальны фільм або спектакль, як нейкае займальнае відовішча — і не больш таго.

Між тым перабудова ў культуры, мастацтве, як вельмі выразна было сказана на XXVII з'ездзе КПСС, датычыць перш-наперш не вольнага часу, а таго, што з'яўляецца дзейсным сродкам актывізацыі чалавека, абуджэння яго грамадскай свядомасці.

Сёння, калі мы маем практычна суцэльную адукаванасць, магутную матэрыяльна-тэхнічную базу культуры, створаную за гады Савецкай улады, калі скарбніца культурных здабыткаў чалавецтва ўзбагачаецца творамі шматнацыянальнага савецкага мастацтва,— гэта становіцца рэальным і зусім дасягальным.

На самай справе: цяпер усімі відамі навучання ў рэспубліцы ахоплена каля 3 мільёнаў чалавек. К канцу 1987 года 5,7 мільёна чалавек мелі вышэйшую і сярэднюю (поўную і няпоўную) адукацыю, сярод насельніцтва, занятага ў народнай гаспадарцы, гэты паказчык склаў 86 працэнтаў. У 1987 годзе выдадзена больш як 57 мільёнаў экземпляраў кніг і брашур. Культурна-асветную работу ў гарадах і вёсках вядуць 6494 масавыя бібліятэкі, 6289 клубных устаноў, 7036 кінаўстановак, 76 музеяў, 19 прафесійных тэатраў, 4 філармоніі. У музеях за мінулы год пабывалі каля 5 мільёнаў чалавек, у тэатрах і на філарманічных канцэртах — амаль 9 мільёнаў, кінасеансы наведалі больш як 121 мільён. Летась за кошт усіх крыніц фінансавання адкрыты клубы і дамы культуры на 18,9 тысячы месцаў.

Значна актывізавалася жыццядзейнасць творчых саюзаў, іх роля ў грамадстве. З'езды саюзаў кінематаграфістаў, тэатральных дзеячаў, пісьменнікаў, іх наступныя сакратарыяты і пленумы прапанавалі шмат ідэй, што датычаць якасных змен у змесце і скіраванасці работы гэтых і іншых аб'яднанняў творцаў-прафесіяналаў.

Створаны новыя грамадскія арганізацыі — Беларускі фонд культуры, Беларускае музычнае таварыства, арганізуюцца аматарскія аб'яднанні, тэатры-студыі, праводзіцца эксперымент па ўдасканаленню кіравання і эфектыўнасці дзейнасці тэатра, распрацавана і ўкараняецца ў практыку новая мадэль кінавытворчасці, ажыццёўлена рэспубліканская выстаўка твораў маладых мастакоў з прынцыпова новай сістэмай адбору экспанатаў і новай экспазіцыяй, наладжаны шэраг буйных маладзёжных фестываляў і г. д.

Аднак, нягледзячы на пазітыўныя тэндэнцыі, становішча спраў з культурай у тых ці іншых абласцях рэспублікі пакуль не можа задаволіць патрабаванні грамадскасці. У больш як 615 вёсках з колькасцю жыхароў за 300 чалавек няма клубаў, амаль у 3 тысячах наяўных клубных устаноў — пакояў для гурткоў. 40 раённых цэнтраў не маюць тыпавых дамоў культуры, а 24 — стацыянарных кінатэатраў. Паводле статыстычных звестак пры росце грашовых даходаў сем'яў рабочых і калгаснікаў у 1,6—2 разы расходы на наведанне кіно, тэатра, канцэртаў і інш. у іх сямейным бюджэце скараціліся: у рабочых і служачых з 1 да 0,7 працэнта, у калгаснікаў — з 0,5 да 0,3 працэнта.

Зразумела, тут вінаваты многія, у тым ліку і самі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеячы літаратуры і мастацтва, якія нярэдка множылі маламастацкія, рамесніцкія падробкі пад нешта сур'ёзнае. Выхоўваючы на такіх «творах» густы чытачоў, гледачоў, слухачоў, яны прывучылі ставіцца да мастацтва самае лепшае як да ўпрыгожання вольнага часу, а не адлюстравання, асэнсавання глыбінных думак і пачуццяў народа, гэта значыць, і сваіх уласных. Яны адвучвалі шукаць і знаходзіць у мастацкіх тварэннях ідэйны, духоўны гарт. І тое і другое пярэчыць пафасу перабудовы.

Сёння ж у асяроддзі творчай інтэлігенцыі перабудова займела шматлікіх прыхільнікаў. Яны вераць у яе, з адкрытым сэрцам падтрымліваюць яе. Іх вера і падтрымка яскрава адрозніваюцца ад папярэдніх дакляраваных не раз і веры, і падтрымкі палкасцю, перакананасцю, смеласцю і канструктыўнасцю мыслення, а таксама захадаў па яго рэалізацыі. Пра гэта сведчыць, дарэчы, барацьба ў творчых саюзах з негатыўнымі з'явамі. Прэтэнзіі дагматызму, антыдэмакратычныя метады і звычкі трапілі пад агонь бязлітаснай, доказнай крытыкі. Карацей кажучы, забяспечаны перадумовы для адраджэння паўнакроўнага жыцця ідэй, для плённай працы на ніве творчасці.

І ўсё ж перамены даюцца нялёгка. Многія пазітыўныя працэсы, толькі азначыўшыся, запаволіліся, амаль да знаёмага ўжо таптання на месцы. Курс на ліквідацыю дыспрапорцый у культуры, на галоснасць пры абмеркаванні грамадскай атмасферы ў творчых саюзах, форм работы ў іх, на паслядоўную дэмакратызацыю мастацкага жыцця — курс на перабудову не набыў яшчэ належнага дынамізму. Нярэдка ён сустракае супраціўленне як у кіраўнічым эшалоне, так і ў кампаніі творцаў, схільных да настрояў утрыманства, тых, хто зусім задавальняўся дырэктыўнасцю і апекай, хто прывык жыць і працаваць ва ўмовах ураўнілаўкі.

Арыентацыя на павышэнне ініцыятывы і самастойнасці творчых саюзаў шмат якімі мастакамі яшчэ не ўспрымаецца ў галоўным — як фактар павышэння іх асабістай грамадзянскай і прафесійнай актыўнасці і адказнасці. Шчырая падтрымка праграмных задач, пастаўленых XXVII з'ездам КПСС, наступнымі пленумамі ЦК, XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыяй, не атрымалі пакуль адэкватнага выражэння ў мастацкай творчасці. Пытанні майстэрства, змястоўнасці мастацтва, асваення ім новых тэм, ягонай ролі ў зменах, што датычаць свядомасці і псіхалогіі людзей, часцяком застаюцца ў цяні. У дзейнасці творчых саюзаў на першы план выходзяць раз-пораз арганізацыйныя аспекты, усялякія цэхавыя інтарэсы.

Як бачым, перабудова творчага жыцця не свабодная ад супярэчнасцей. Сімптомам недастатковай сувязі мастацкай творчасці з жыццём, з працэсамі абнаўлення ў краіне з'яўляецца невысокі ў цэлым узровень пісьменніцкай публіцыстыкі. Прызнаем: гэта тлумачыцца ў значнай меры і тым, што нам не ўдалося стварыць атмасферу грамадскай падтрымкі аўтараў, якія выступаюць з пазіцый пераасэнсавання жыццёвых праблем і творчай дзейнасці.

Трывожыць, напрыклад, адсутнасць у драматургаў, за рэдкім выключэннем, глыбокага зацікаўлення патрэбамі, клопатамі, марамі і спадзяваннямі нашых сучаснікаў. А гэта, у сваю чаргу, змушае тэатры разважаць пра сучаснасць пераважна на старым драматургічным матэрыяле. Ды і ў саміх тэатрах слаба пакуль выкарыстоўваюцца магчымасці, што адкрываюцца ў ходзе тэатральнага эксперыменту, для ініцыятыўных пачынанняў, для ўзбагачэння рэпертуару, для згуртавання калектыву на глебе перспектыўных мастакоўскіх замыслаў. Насцярожанасць некаторых тэатральных дзеячаў у адносінах да эксперыменту, апрача таго, падмацоўваецца чакальнай пазіцыяй планавых, фінансавых, гандлёвых арганізацый. І замінае тут не толькі аблудны рэштквавы прынцып. Сур'ёзнай перашкодай для адраджэння сапраўды творчага жыцця было і застаецца мноства састарэлых, аджылых і часам узаемавыключальных інструкцый, нарматыўных актаў, якімі кіруюцца тэатры часта не на карысць сабе.

На пленумах, партыйных сходах творчых саюзаў можна пачуць, што ёсць нямала дзеячаў культуры, якія займаюцца самарэкламай, пастаянна выстаўляюць публічна свае правы, у тым ліку правы на першачарговае задавальненне дабротамі, узвышаюць асабістыя інтарэсы над грамадскімі і г. д. Так, ва ўмовах галоснасці ўзнікаюць не толькі плённыя ініцыятывы і слушныя пачынанні. Дзе-нідзе ўзнімаюцца на паверхню і назапашаныя за мінулыя гады абмежаванасці, хцівасць, спажывецтва, эгаізм, індывідуалізм. Гэта таксама па-свойму заканамерна.

Маральная і сацыяльная непераборлівасць, беспрэцэдэнтная «гнуткасць», якая пашырылася ў гады застою і яшчэ не мінулася, шмат у чым абумоўлены непаслядоўнасцю выкарыстання крытэрыяў мастацкай і сацыялістычнай ідэйнасці. Рабілася гэта дзеля паказнога дабрабыту і фіктыўнага адзінства, якія доўга выдаваліся за дасягненні. Але ж У. І. Ленін вучыў іншаму: «Першы абавязак тых, хто хоча шукаць «шляхоў да чалавечага шчасця»,— не марочыць саміх сябе, мець смеласць прызнаць шчыра тое, што ёсць». Такім чынам, у кожнай справе, у дыскусіях, у ацэнцы з'яў мастацтва, у высвятленні ісціны неабходна зыходзіць з таго, што ёсць, даваць палітычнае і маральнае вызначэнне дакладна, без ілюзій, без замоўчвання фактаў і, вядома, даражыць талентам, паважаць яго пошукі і здзяйсненні.

Сёння перад творчымі саюзамі, іх партыйнымі арганізацыямі ставіцца задача актыўней дапамагаць светапогляднаму сталенню і росту прафесійнай годнасці ва ўсіх слаях мастацкай інтэлігенцыі, цвёрда процістаяць, процідзейнічаць дробязнаму самалюбаванню, нездароваму саперніцтву. І поруч з тым — сцвярджаць нормы сапраўднага дэмакратызму, спрыяць натуральнаму спаборніцтву талентаў, стымуляваць абмеркаванне буйных творчых і жыццёвых праблем.

Далейшае павышэнне сацыяльнай ролі мастацтва вымагае новай якасці яго сувязі з запатрабаваннямі шырокіх мас. Аднак у дзейнасці творчых саюзаў гэтую выснову ўлічваюць і ўсведамляюць не заўсёды. Найбольш відавочна такое становішча раскрываецца ў музычных арыентацыях і прыхільнасцях моладзі. Цяжка, напрыклад, пераацаніць удзел кампазітараў, выканаўцаў, музыказнаўцаў у эстэтычным выхаванні юнай змены. Менавіта ў школьныя гады павінны закладвацца трывалыя асновы для развіцця гарманічных патрэб асобы. Але ці можам мы сказаць, што наша музычнае мастацтва па-сапраўднаму ўзбагачае духоўны свет маладога, ды і не толькі маладога чалавека разнастайнасцю сваіх відаў, жанраў, форм, індывідуальнасцей?

Вядома ж, не. Хіба мала яшчэ яўна слабых твораў, якія пасля закупкі Міністэрствам культуры БССР выконваюцца адзін-два разы альбо ўвогуле пакрыва-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

юцца пылам на паліцах? А ў той жа час праблемы выхавання музычных густаў моладзі набываюць усё большую вастрыню. Дастаткова зазначыць, што ў спісе самых папулярных кампазітараў года, якія карыстаюцца асаблівай сімпатыяй маладых слухачоў, няма ніводнага члена Саюза кампазітараў рэспублікі. Саюз стаіць убаку ад аўтарскіх песень, ад сучаснай маладзёжнай музыкі, ад аматарскіх аб'яднанняў. Значыць, наспела неабходнасць рашучага выпраўлення цяперашняга становішча — становішча спакою і цярплівасці, самаўпэўненасці і кансерватызму. Варта задумацца пра слушнасць, пра надзённасць дэмакратызацыі музычнага мастацтва. Гаворка ідзе не пра тое, каб патураць непатрабавальным густам. Але ведаць распаўсюджанне такіх густаў, асабліва падатлівых капрызам моды, неабходна, каб дамагацца іх ўзвышэння.

Мінула два гады пасля чарговага з'езда Саюза мастакоў Беларусі. І можна засведчыць: у рабоце саюза адчуваюцца зрухі да лепшага. З апошніх справаздач праўлення вынікае, што самыя важныя пытанні, якія хвалююць усіх мастакоў,— пытанні творчыя. І сакратарыят саюза, і кіраўніцтва творчых секцый, паступова вызваляючыся ад унутранай зарэдагаванасці, рэгламентацыі, дагматычнага разумення мэтаў і задач творчасці, звяртаюць на гэтыя пытанні пільную ўвагу. Хацелася б, каб такое імкненне дзейсна падмацоўвалася ў самой масе мастакоў. Пара ім ад размоў ды выступленняў пра павышэнне эстэтычнага ўзроўню твораў пераходзіць да практыкі і паказваць прыклад, як дасягнуць жаданага ўзроўню.

А зрабіць яшчэ трэба шмат чаго. Рупіць ужо макрэсліць вартыя, эфектыўныя крытэрыі ацэнкі мастацкага твора. Мэтазгодна расшырыць міжрэспубліканскі выставачны абмен, камплектаванне музеяў творамі з усіх абласцей нашай рэспублікі. На парадку дня — наданне большай самастойнасці абласным арганізацыям Саюза мастакоў, стварэнне ў Мінску абласнога і гарадскога аддзяленняў. Найпершых клопатаў і намаганняў заслугоўвае работа з моладдзю — будучыняй беларускага мастацтва.

Вельмі важна прааналізаваць, што дзеецца ў выставачных залах. Выставак прыкметна пабольшала. У паўтара раза павялічылася колькасць персаноўных экспазіцый, якія былі паказаны больш як у 110 гарадах і раённых цэнтрах рэспублікі. Удвая больш выставак беларускага мастацтва накіроўваецца цяпер за мяжу. Усяго за пяць гадоў іх адбылося больш як 500.

І ўсё ж многае тут выклікае заклапочанасць, а то і трывогу. Нягледзячы на поспех тых ці іншых выставак, грамадская цікавасць да іх у цэлым падае. Таму ёсць сэнс выразна дыферэнцыраваць выстаўкі не толькі па відах і жанрах, але і па глядацкіх аўдыторыях, якім яны адрасаваны. Саюзу мастакоў БССР, Міністэрству культуры БССР неабходна выкарыстаць усе сілы і сродкі для хутчэйшай рэалізацыі праграмы адкрыцця выставачных залаў і карцінных галерэй.

За апошнія гады значна актывізавалася дзейнасць Саюза кінематаграфістаў БССР. Перш за ўсё гэта датычыць секцыі дакументальнага кіно. Бо менавіта кінадакументалісты аказаліся на пярэднім краі барацьбы за перабудову. Шмат увагі надаецца пошукам новай мадэлі кінавытворчасці, што грунтуецца на пераходзе ад адміністрацыйных метадаў кіравання да эканамічных. У цяперашнюю кінавытворчасць укараняюцца прынцыпы гаспадарчага разліку, якія ў далейшым дазволяць перайсці на самаакупнасць і самафінансаванне. Сёння Саюз кінематаграфістаў Беларусі непасрэдна ўдзельнічае з уласнымі распрацоўкамі ў вырашэнні асноўных праблем кіравання, звязаных з кінавытворчасцю, а таксама падборам і расстаноўкай кіраўнікоў сярод творчых кадраў галіны.

Зразумела, шукаючы новыя формы работы ў творчых саюзах, у сферы культуры наогул, як і любым эксперыменце, складана пазбегнуць памылак, магчымых празмернасцей ці нават скажэнняў. Але У. І. Ленін быццам прадбачыў сённяшнюю сітуацыю, калі ў грозныя паслярэвалюцыйныя гады пісаў: «Імкненне ствараць культуру, распаўсюджваць яе ў нас незвычайна моцнае. Трэба прызнаць, што пры гэтым у нас робіцца шмат эксперыментаў, поруч з сур'ёзным у нас шмат дзяцінага, няспелага, што адымае сілы і сродкі. Аднак, відаць, творчае жыццё вымагае трат у грамадстве, як і ў прыродзе».

Часы рэвалюцыйных пераўтварэнняў непазбежна выяўляюць рэальны стан грамадства, ступень яго гатоўнасці і падрыхтаванасці да перамен, узровень сацыяльнай і гістарычнай самасвядомасці. У такія часы надзвычай узрастае роля мастака, які абвострана спасцігае праўду жыцця і чалавека, мастака, які пранікнёна паказвае не толькі бясспрэчныя дасягненні, але і розныя пралікі, хібы.

У рэзалюцыі XIX Усесаюзнай канферэнцыі КПСС «Аб ходзе рэалізацыі рашэнняў XXVII з'езда КПСС і задачах па паглыбленню перабудовы» сказана пра высокую адказнасць дзеячаў літаратуры і мастацтва перад народам. Сёння да іх вытворчасці асаблівыя патрабаванні. Ад яе чакаюць глыбока рэалістычнага, да канца праўдзівага, па-ленінску партыйнага адлюстравання канкрэтных праблем і супярэчнасцей грамадскага развіцця, трапяткога рытму сучаснасці ў жыцці краіны і запатрабаванняў савецкага чалавека. Толькі здаровая атмасфера, калі пануе дух творчага спаборніцтва, калі тон задаюць дастойныя крытэрыі вартасцей мастацкіх твораў, калі ўзмацняецца патрабавальнасць мастака да самога сябе і гартуецца яго грамадзянская пазіцыя, забяспечыць паспяховы рух да эпахальных па сваёй сутнасці мэтаў.

На гэта сёння павінна быць нацэлена работа партыйных камітэтаў, творчых саюзаў і іх партыйных арганізацый. Час вырашаць задачы перабудовы ў творчых саюзах так, каб максімальна стымуляваць ініцыятыву дзеячаў літаратуры і мастацтва, пераадолець у многіх з іх пасіўнасць, грамадзянскую шэрасць, апатыю, несамастойнасць мыслення — гэтыя прамыя выдаткі бюракратычнага стылю кіраўніцтва. Галоўны вынік работы творчых саюзаў, як падкрэслівалася на XXVII з'ездзе КПСС, «вымяраецца не рэзалюцыямі і пасяджэннямі, а таленавітымі, арыгінальнымі, патрэбнымі грамадству кнігамі, фільмамі, спектаклямі, карцінамі і музычнымі творамі».

Узбагачаць духоўны свет савецкага чалавека магчыма толькі ва ўмовах пастаяннага абнаўлення дзейнасці творчых саюзаў і ўстаноў культуры на аснове галоснасці і дэмакратызацыі, крытыкі і самакрытыкі, патрабавальнасці і аб'ектыўнасці ў ацэнках. Гэтага вымагае ад дзеячаў культуры само жыццё. Гэта ж з'яўляецца і адным з найважнейшых прынцыпаў партыйнага кіраўніцтва сацыялістычнай культурай на сучасным этапе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ